# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

4 верасня 2024 г. № 350 г.Мінск

**Аб Падзяцы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

У мэтах далейшага ўдасканальвання прававога рэгулявання адносін, звязаных з прадстаўленнем да аб'яўлення Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастанаўляю:

1. Зацвердзіць:

Палажэнне аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (прыкладаецца);

узор спецыяльнага ліста аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (для фізічных асоб) (прыкладаецца);

узор спецыяльнага ліста аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (для арганізацый або калектываў работнікаў арганізацый) (прыкладаецца);

апісанне спецыяльнага нагруднага знака да Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (прыкладаецца).

2. Фінансаванне работ па вырабе спецыяльных лістоў аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, спецыяльных нагрудных знакаў да Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і каштоўных падарункаў ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжаных на ўтрыманне Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

3. Прызнаць страціўшымі сілу ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (дадатак).

4. Дадзены Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

12

Дадатак
да Указа Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
04.09.2024 № 350

ПЕРАЛІК
страціўшых сілу ўказаў Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь

1. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 чэрвеня 2008 г. № 340 ”Аб Падзяцы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь“.

2. Пункт 2 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 621 ”О внесении изменений и дополнений в некоторые указы Президента Республики Беларусь по вопросам Следственного комитета Республики Беларусь“.

3. Падпункт 7.35 пункта 7 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2013 г. № 529 ”О некоторых вопросах деятельности судов Республики Беларусь“.

4. Падпункт 1.1 пункта 1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 мая 2017 г. № 184 ”Об изменении указов Президента Республики Беларусь“.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
04.09.2024 № 350

# ПАЛАЖЭННЕ

## аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1. Дадзеным Палажэннем устанаўліваецца парадак прадстаўлення грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства (далей, калі не ўказана іншае, – грамадзяне), юрыдычных асоб, грамадскіх аб'яднанняў і іншых арганізацый, воінскіх часцей, падраздзяленняў, злучэнняў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў (далей – арганізацыі), калектываў работнікаў арганізацый да аб'яўлення Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (далей – Падзяка).

2. Падзяка грамадзянам, арганізацыям, калектывам работнікаў арганізацый аб'яўляецца за:

шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне працоўных абавязкаў і іншыя дасягненні ў рабоце;

высокія паказчыкі ў службовай дзейнасці;

праяўленыя мужнасць і знаходлівасць;

выдатную вучобу;

высокае прафесійнае майстэрства і выдатныя дасягненні ў сферах адукацыі, культуры, спорту, аховы здароўя;

плённую вытворчую, навуковую і грамадска-палітычную дзейнасць;

значныя дасягненні ў гаспадарчым, сацыяльна-эканамічным развіцці, ва ўмацаванні законнасці, правапарадку і абараназдольнасці краіны;

іншыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь.

3. Падзяка грамадзянам, арганізацыям, калектывам работнікаў арганізацый аб'яўляецца па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Падзяка можа аб'яўляцца таксама па ініцыятыве Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Падзяка Старшыні і намеснікам Старшыні Усебеларускага народнага сходу можа аб'яўляцца па ініцыятыве Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу, работнікам Сакратарыята і дэлегатам Усебеларускага народнага сходу – па ініцыятыве Старшыні альбо намеснікаў Старшыні Усебеларускага народнага сходу.

Падзяка работнікам (супрацоўнікам), у тым ліку якія займаюць выбарныя дзяржаўныя пасады, дзяржаўных органаў згодна з дадаткам 1, іх тэрытарыяльных органаў, апаратаў, сакратарыятаў, арганізацый, якія ўваходзяць у склад, сістэму гэтых дзяржаўных органаў, падпарадкаваны ім або акцыі (долі ў статутных фондах) якіх перададзены ім у аператыўнае кіраванне (кіраванне) (далей для мэт дадзенага пункта – работнікі), а таксама арганізацыям,

якія ўваходзяць у склад, сістэму гэтых дзяржаўных органаў ці падпарадкаваны ім або акцыі (долі ў статутных фондах) якіх перададзены ім у аператыўнае кіраванне (кіраванне), калектывам іх работнікаў можа аб'яўляцца па ініцыятыве кіраўнікоў адпаведных дзяржаўных органаў.

Кіраўнікі дзяржаўных органаў, названых у частках другой і трэцяй дадзенага пункта і дадатку 1, уносяць прадстаўленне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь для аб'яўлення Падзякі:

грамадзянам – згодна з дадаткам 2;

арганізацыям, калектывам работнікаў арганізацый – згодна з дадаткам 3.

4. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь або іншы дзяржаўны орган, упаўнаважаны ініцыіраваць аб'яўленне Падзякі, накіроўвае прадстаўленне, прадугледжанае ў частцы пятай пункта 3 дадзенага Палажэння, у Дзяржаўны сакратарыят Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь для атрымання заключэння.

5. Хадайніцтвы аб аб'яўленні Падзякі грамадзянам узбуджаюцца па месцы працы (вучобы, службы) грамадзян кіраўніком арганізацыі і накіроўваюцца па падпарадкаванасці ў адпаведныя рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання або абласны (Мінскі гарадскі) выканаўчы камітэт, для арганізацый, якія не маюць падпарадкаванасці, – у абласны (Мінскі гарадскі) выканаўчы камітэт, а затым уносяцца для разгляду ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь (за выключэннем хадайніцтваў аб аб'яўленні Падзякі асобам, названым у частках трэцяй і чацвёртай пункта 3 дадзенага Палажэння).

Хадайніцтвы аб аб'яўленні Падзякі замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія пражываюць у іншых краінах, узгадняюцца з Міністэрствам замежных спраў.

6. Хадайніцтвы аб аб'яўленні Падзякі арганізацыям, калектывам работнікаў арганізацый узбуджаюцца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання або абласнымі (Мінскім гарадскім) выканаўчымі камітэтамі і ўносяцца для разгляду ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь (за выключэннем хадайніцтваў аб аб'яўленні Падзякі арганізацыям, калектывам работнікаў арганізацый, названым у частцы чацвёртай пункта 3 дадзенага Палажэння).

7. Хадайніцтвы аб аб'яўленні Падзякі, якія ўносяцца для разгляду ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, павінны ўключаць:

для аб'яўлення Падзякі грамадзяніну:

прадстаўленне згодна з дадаткам 2, падпісанае кіраўніком рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання або старшынёй абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, для арганізацый, якія не маюць падпарадкаванасці, – старшынёй абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта;

даведку-аб'ектыўку, падпісаную кіраўніком арганізацыі, якая ўзбуджае хадайніцтва аб аб'яўленні Падзякі;

для аб'яўлення Падзякі арганізацыі, калектыву работнікаў арганізацыі:

прадстаўленне згодна з дадаткам 3, падпісанае кіраўніком рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання або старшынёй абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, для арганізацый, якія не маюць падпарадкаванасці, – старшынёй абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта;

даведку аб асноўных эканамічных паказчыках работы арганізацыі, якая вядзе гаспадарчую дзейнасць, за апошні год работы і справаздачны перыяд бягучага года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на дату прадстаўлення да аб'яўлення Падзякі, падпісаную кіраўніком гэтай арганізацыі і ўзгодненую з адпаведным органам дзяржаўнай статыстыкі;

звесткі аб актуальнай назве арганізацыі ў адпаведнасці з устаноўчымі дакументамі.

8. Хадайніцтвы аб аб'яўленні Падзякі разглядаюцца ў Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і ў выпадку прыняцця станоўчага рашэння ўносяцца Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь праз Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

9. Прадстаўленні запаўняюцца на беларускай мове з выкарыстаннем камп'ютарнай тэхнікі. Усе пазначаныя графы павінны быць запоўнены і ўключаць дакладную інфармацыю. Змешчаныя ў прадстаўленнях характарыстыка асобы грамадзяніна, інфармацыя аб арганізацыі, калектыве работнікаў арганізацыі павінны ўтрымліваць усебаковую ацэнку заслуг і дасягненняў.

10. Падзяка аб'яўляецца распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Грамадзянам уручаюцца спецыяльныя лісты аб аб'яўленні Падзякі, спецыяльныя нагрудныя знакі да Падзякі і каштоўныя падарункі (коштам да 25 базавых велічынь кожны).

Арганізацыям, калектывам работнікаў арганізацый уручаюцца толькі спецыяльныя лісты аб аб'яўленні Падзякі.

Абмежаванні, прадугледжаныя ў абзацы дзявятым часткі першай і абзацы другім часткі пятай артыкула 17 Закона Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2015 г. № 305-З "О борьбе с коррупцией", не распаўсюджваюцца на атрыманне дзяржаўнай службовай асобай або прыраўнаванай да яе асобай, іх мужам (жонкай), блізкімі сваякамі ці сваякамі ў сувязі з выкананнем дзяржаўнай службовай асобай або прыраўнаванай да яе асобай службовых (працоўных) абавязкаў каштоўных падарункаў, названых у частцы другой дадзенага пункта.

11. Праекты распараджэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб аб'яўленні Падзякі падрыхтоўваюцца ў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

12. Спецыяльны ліст аб аб'яўленні Падзякі, спецыяльны нагрудны знак да Падзякі і каштоўны падарунак уручаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь ці па яго даручэнні:

Старшынёй Усебеларускага народнага сходу або яго намеснікамі;

Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь або яго намеснікамі;

Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь або яго намеснікамі;

Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь або яго намеснікамі;

Кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь або яго намеснікамі;

Дзяржаўным сакратаром Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь або яго намеснікамі;

Кіраўніком спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь або яго намеснікамі;

іншымі асобамі, упаўнаважанымі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

13. Спецыяльны ліст аб аб'яўленні Падзякі, спецыяльны нагрудны знак да Падзякі і каштоўны падарунак уручаюцца асабіста грамадзяніну ва ўрачыстай абстаноўцы не пазней як праз месяц з дня падпісання Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь адпаведнага распараджэння.

Спецыяльны ліст аб аб'яўленні Падзякі арганізацыі, калектыву работнікаў арганізацыі ўручаецца на ўрачыстым сходзе або пасяджэнні гэтых арганізацый, калектыву.

14. Асоба, якая ўручыла спецыяльны ліст аб аб'яўленні Падзякі, спецыяльны нагрудны знак да Падзякі і каштоўны падарунак, падпісвае пратакол аб праведзеным уручэнні ў двух экзэмплярах згодна з дадаткам 4. Названы пратакол да пятага чысла наступнага месяца накіроўваецца ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

15. Спецыяльны нагрудны знак да Падзякі носіцца на правым баку грудзей пасля Ганаровага знака лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, а пры яго адсутнасці – на месцы гэтага знака.

Дадатак 1
да Палажэння аб аб'яўленні
Падзякі Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь

ПЕРАЛІК

дзяржаўных органаў, кіраўнікі якіх могуць
ініцыіраваць аб'яўленне Падзякі Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь

1. Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.
2. Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.
3. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь.
4. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.
5. Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.
6. Дзяржаўны сакратарыят Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь.
7. Камітэт дзяржаўнага кантролю.
8. Генеральная пракуратура.
9. Нацыянальны банк.
10. Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.
11. Цэнтральная выбарчая камісія.
12. Служба бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.
13. Аператыўна-аналітычны цэнтр пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.
14. Камітэт дзяржаўнай бяспекі.
15. Следчы камітэт.
16. Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз.

Дадатак 2
да Палажэння аб аб'яўленні
Падзякі Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь

**ПРАДСТАЎЛЕННЕ**

1. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) ____________
______________________________________________________________________
2. Прафесія рабочага, пасада служачага, месца працы (вучобы, службы) __
______________________________________________________________________
3. Чысло, месяц і год нараджэння _____________________________________
4. Грамадзянства _____________________________________________________
5. Адукацыя _________________________________________________________
6. Ці аб'яўлялася раней Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і дата аб'яўлення _________________________________________________________
7. Месца жыхарства або знаходжання і тэлефон ______________________
______________________________________________________________________
8. Агульны стаж работы (тэрмін службы) ____________________________
Стаж работы (тэрмін службы) у галіне ______________________________
Стаж работы (тэрмін службы) у дадзеным калектыве __________
9. Асаблівыя заслугі, за якія прадстаўляецца да аб'яўлення Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ______________________________________
______________________________________________________________________

Кіраўнік рэспубліканскага органа
дзяржаўнага кіравання (старшыня
абласнога (Мінскага гарадскога)
выканаўчага камітэта) ______________________________
(подпіс, ініцыялы, прозвішча)

М.П.

___ ______________ _____ г.

Дадатак 3
да Палажэння аб аб'яўленні
Падзякі Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь

# ПРАДСТАЎЛЕННЕ

1. Назва арганізацыі (калектыву работнікаў арганізацыі) ________________
2. Адрас месца знаходжання ________________________________________
3. Перыяд дзейнасці (дата заснавання)____________________________
4. Заслугі, за якія прадстаўляецца да аб'яўлення Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ________________________________________________
____________________________________________________________________
____________________________________________________________________
____________________________________________________________________

Кіраўнік рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання (старшыня абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта) ______________________________________

(подпіс, ініцыялы, прозвішча)

М.П.

___ ______________ _____ г.

Дадатак 4
да Палажэння аб аб'яўленні
Падзякі Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь

## ПРАТАКОЛ
## уручэння спецыяльнага ліста аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, спецыяльнага нагруднага знака да Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і каштоўнага падарунка

______________________________          ______________________________
(месца ўручэння)                                        (дата ўручэння)

Мною, ____________________________________________________________
(пасада, прозвішча і ініцыялы асобы, якая ўручыла спецыяльны ліст
__________________________________________________________________,
аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, спецыяльны нагрудны знак
__________________________________________________________________
да Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і каштоўны падарунак)

ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь уручаны спецыяльны ліст аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, спецыяльны нагрудны знак да Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і каштоўны падарунак:

| № п/п | Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) узнагароджанага, назва арганізацыі | Дата і нумар адпаведнага распараджэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь | Спецыяльны нагрудны знак да Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь | Каштоўны падарунак |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |

__________________________________________
(подпіс асобы, якая ўручыла спецыяльны
ліст аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,
спецыяльны нагрудны знак да Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі
Беларусь і каштоўны падарунак)

М.П.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
04.09.2024 № 350

УЗОР

спецыяльнага ліста аб аб’яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (для фізічных асоб)



ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
04.09.2024 № 350

УЗОР

спецыяльнага ліста аб аб’яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (для арганізацый або калектываў работнікаў арганізацый)



ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
04.09.2024 № 350

АПІСАННЕ

спецыяльнага нагруднага знака да Падзякі
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Спецыяльны нагрудны знак да Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (далей – спецыяльны нагрудны знак) уяўляе сабой рэльефнае адлюстраванне штандара Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у спалучэнні з чырвонай стужкай з надпісам ”БЛАГОДАРНОСТЬ ПРЕЗИДЕНТА“. Палотнішча штандара пакрыта эмаллю чырвонага, зялёнага і белага колераў.

Вышыня спецыяльнага нагруднага знака – 27 мм, шырыня – 26 мм. Знак пры дапамозе вушка і кольца спалучаецца з калодкай шырынёй 24 мм і вышынёй разам з вушкам 18 мм. Калодка абцягнута муаравай стужкай чырвонага колеру шырынёй 22 мм з дзвюма вузкімі падоўжнымі палоскамі залацістага колеру па краях шырынёй 1 мм. У ніжняй частцы калодкі размешчаны надпіс ”РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ“. На адваротным баку – шпілька для мацавання знака да адзення.

Спецыяльны нагрудны знак вырабляецца з тампаку з пазалотай.